Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 8 (649). Wilnia, Niadziela 16 Lutaha 1936 h. Hod XII (XX)

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.

HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.

Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Składka u hod 4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

СЫРЫЯ ЗА НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ

Вызвольны нацыянальна-палітычны рух розных народаў ахапіў увесь сьвет. Сяньня ўсе народы імкнуцца да вольнасьці й незалежнасьці. Аб многіх гэткіх народах пісалі мы ўжо ў «Бел. Крыніцы» няраз. Сяньня пішам аб Сырыі і аб яе палітычным і нацыянальным вызваленьні. Нагоду пісаць нам аб гэтым далі весткі, што апошнім часам паявіліся ў газэтах аб крывавых забурэньнях у Сырыі, падкладам якіх зьяўляюцца імкненьні вызвольныя імкненьні гэнай краіны.

Сырыя — па арабску Сурія або Шам — гэта самая заходняя краіна Азіі, над Сяродземным морам; на поўнач ад яе Турцыя й Армэнія, на ўсход Пэрсія, на поўдзень Палестына й Арабія. Над морам выгодныя прыстані, з якіх галоўная Бэйрут. На ўсходзе горы, сярэдняя часьць каторых завецца Лібан і Антылібан. Галоўныя рэкі: Ярдан і Оронтэс, гарады: Дамашк, Галеб і інш.

Клімат Сырыі: над морам лагодны, у горах зімны і вільготны; у далінах між Лібанам і Антылібанам і ў далінах рэк Ярдану і Оронтэсу дужа цёплы, на самым усходзе гарачы, вострый і пустынны.

З дрэў у Сырыі растуць: пініі, сьверкі, бујныя ялаўцы, дубы, аліўкі, пладовыя дрэвы, вінаградная лаза.

Насельніцтва Сырыі пад узглядам расовым даволі мяшанае. Пераважае аднак раса сэміцкая, з якой паходзіць народ сырыйскі, ведамы ў гісторыі так жа пад назовай арамэяў. Сырыйцы ў старадаўнасьці (яшчэ прад Хрыстом) мелі сваю магутную дзяржаву, якая аднак пасьля папала ў няволю Асырыі, па ёй Эгіпту, Бабілёніі, Мэдаў, Пэрсаў, Македоніі, пазьней занялі Сырыю Рымляне, Пэрсы й урэшце ў VII ст. па Хрысьце Арабы. Арабы большасьці Сырыйцаў накінулі сваю мову і магомэтанізм. Ад пач. XVI ст. над Сырыяй запанавалі Туркі, правінцыяй якой і была Сырыя аж да апошняй сусьветнай вайны.

Сырыя займае прастор 155.000 кв. клм.; усяго насельніцтва да трох міліонаў, з якіх найбольш (да 2 міліонаў) сырыйцаў. Рэшта: арабы, курды, туркі, туркмэны, жыды, цыганы, чаркесы і інш. Паводле рэлігіі да двух міліонаў — магамэтане, паўміліона хрысьціяне розных абрадаў, рэшта — розныя іншыя.

Насельніцтва Сырыі займаецца пераважна земляробствам і агародніцтвам (пшаніца, проса, кукуруза, бавоўна, агуркі, мэлёны, цукровая трасьціна, вінаград, аліўкі, цытрына, памаранчы, морэлі, фігі, морва і інш.), а часткова (на ўсходзе) пастырствам (вярблюды, быдла, козы, авечкі і інш.).

Многа ў Сырыі ёсьць таксама багацьця прыроднага: (жалеза, вугаль, скальны алей, мармур, фосфат, медзь, нікель).

Вялікая сусьветная вайна, як усюды, так і ў Сырыі, нарабіла многа зьменаў. У 1918 г. Англія прагнала з Сырыі Турцыю. У радох аднак брытыйскай арміі было многа арабаў і сырыйцаў, як дабравольцаў, што былі арганізаваны ў асобныя вайсковыя часьці і ваявалі пад камандай Фэйзаля, сына шэрыфа Мэккі Гусэйна, што разам з бацькам кіраваў арабскім паўстаньнем проціў Турэччыны. Пры падтрыманьні гэтага арабска-сырыйскага войска ў Дамашку адбываецца сырыйскі нацыянальны кангрэс, які Сырыю абвяшчае незалежным каралеўствам, каралём якога назначае таго-ж Фэйзаля.

Сырыя такім чынам сталася незалежнай дзяржавай, але, ясная рэч, пад апекай Англіі. Францыі гэта было не да ўспадобы, тым больш, што яна ў Сырыі адлаўна мела свае ўплывы праз каталіцкіх місіянараў францускіх. Вось-жа дыплёмацыя француская пастаралася, каб сырыйскае хрысьціянскае насельніцтва, што было пад уплывам францускіх місіянараў, прасіла Францыю ўзяць Сырыю пад сваю «высокую» апеку. Так і сталася. На падставе гэтай «просьбы» канфэрэнцыя антанты ў Сан-Рэмо ў 1920 г. Сырыю аддае Францыі, якая аружнай сілай разьбівае сырыйскую дзяржаўную незалежнасьць. Гэтак Сырыя папала пад апеку Францыі. Апеку гэту пацьвердзіла Ліга Народаў 23.VII.1922.

Вось жа ад гэтага часу аж да апошніх дзён Францыя праз свайго «высокага» камісара ў Сырыі і гаспадарыць аж міла: міла для сябе, а дужа няміла для Сырыі. Яна дзеліць край на розныя «аўтанамічныя» (ці не навучылася аж ад Японія гэтак-жа рабіць у Кітаі, Манджурыі і Манголіі?), штучна павыкройваныя вакругі з уладай, зложанай з сваіх людзей, штучна стварае й падтрымлівае рэлігійную грызьню, асабліва між хрысьціянамі і магомэтанамі і, як толькі можа (а можа яна многа!), усякімі спосабамі спыняе сырыйскі вызвольны палітычна-нацыянальны рух.

Але ня лёгка Францыі справіцца з краем, які сьведама йдзе да сваей незалежнасьці. Яшчэ ў мінулым сталецьці сырыйцы пачынаюць усьведамляць палітычна й нацыянальна. Яны ўжо тады пачынаюць шторaз ясьней разумець, што апрача розьніцы рэлігійнай, ёсьць у іх так многа супольнага: супольная і слаўная мінуўшчына, супольная тэрыторыя, супольная мова або родная сырыйская, або ўжо прынятая за родную мова арабская, супольная сэміцкая раса, супольная нядоля пад турэцкім ярмом. А ўжо ў пач. нашага сталецьця ў Сырыі творыцца супольны сырыйскі фронт для палітычнай барацьбы з Турцыяй. Фронт гэты выказаў вялікую сілу, як мы ўжо ўспаміналі, у 1919—1920 г., выказвае ён і сяньня.

Найсільнейшым доказам неўздаваленьня сырыйцаў з чужой францускай апекі і доказам імкненьня да аб'яднанай незалежнай Сырыі было грознае паўстаньне ў 1925 г. Тады французы былі пайшоўшы на некаторыя ўступкі для Сырыі. Але як усё ўспакоілася, узноў пачалі гаспадарыць пасвойму.

Сырыя аднак ня сьціць. Яна далей борыцца, арганізуецца, злучае і хрысьціян і музульман і інш. у вадно цэлае сырыйскае для поўнага вызваленьня з пад чужой экспляататарскай апекі. Вызвольныя забурэньні апошнім часам узноў робяцца там грознымі. Ёсьць раненыя й забітыя. Камісар Францыі ўсьцяж радзіцца з Парыжам. А Сырыя ўпорыста і безагляднa бароне свае права, сваю справядлівасьць проціў ненасытнага імпэрыялізму...

«Бунт» беларускіх рыбаловаў над Нарацкім і Мядзельскім вазёрах — барацьба сялян за права лоўлі рыбы

У прошлым нумары „Бел. Крыніцы“ мы падавалі, што пачаўся штрэйк беларускіх рыбаловаў Нарачанскага і Мядзельскага вазёраў.

Прычына гэтага штрэйку-„бунту“ рыбаловаў паходзіць з супярэчнасьці закону аб рыбалоўстве з інтарэсамі беларускіх сялян надвазёрных сялі-б Нарача і Мядзельскага возераў.

Летась застасаваны там новы закон аб рыбалоўстве, які наказвае на водах, каторыя становяць уласнасьць больш як аднае праўнае асобы, прымусова тварыць г. зв рыбацкія абводы.

Ня глядзячы на тое, што на Нарацкім і Мядзельскім вазёрах маюць права лавіць рыбу сяляне ваколічных вёсак, а гэтым і права ўласнасьці сваіх вазёрных водаў, дзяржаўная ўлада ўзяла возера Нарач пад свой загад, стварыла з яго рыбацкі абвод і аддала яго ў арэнду Дырэкцыі Дзяржаўных Лясоў, ня пытаючыся ані згоды ані спраціву дасюлешніх бязспорных уласьнікаў, ваколічных сялян-рыбаловаў, каторыя з гэнага возера жывуць.

Такім чынам некалькі тысяч людзей адапхнулі ад натуральнага жарала заработкаў.

Дырэкцыя Дзяржаўных Лясоў паставіла на Нарачы пяць невадаў і затрудніла з гэтых дасюлешніх рыбаловаў толькі каля 150 чалавек, каторым плаціць па 1 зл. за дзень працы. Апрача гэтага Дырэкцыя мае плаціць і арэнду ўласьнікам возера, але яшчэ ня плаціць і чакае, пакуль гэтыя ўласьнікі не дакажуць сваіх уласьніцкіх правоў. Ня ўсе сяляне маюць дакументы, якімі могуць даказаць сваю ўласнасьць вазёрных водаў, большасьць апіраецца на даўнасьці, на традыцыі, на праве дзядоў і прадзедаў. Пры гэтым сяляне-рыбаловы бедныя і ня маюць грошай, каб зачаць і весьці судовы працэс у гэтай справе, які ў найлепшым выпадку працягнецца некалькі гадоў. А нарачанскія і мядзельскія рыбаловы людзі, якія мусяць жыць і ўтрымаць свае сем'і, жаралом утрыманьня каторых зьяўляецца рыбалоўства на Нарачанскім і Мядзельскім вазёрах.

Дзеля гэтага сяляне-рыбаловы пастанавілі дамагацца прызнаньня іхняга права на лоўлю рыбы сваім спосабам.

Сяляне вёсак Наносы, Купа, Галубенькі, Чарэўкі, Пасынкі і інш салідарна, спакойна выйшлі на возера, сабралі невады Дырэкцыі Дзярж. Лясоў, аднесьлі іх на бераг і павесілі на стаякох. Забурэньняў ня было ніякіх.

Гэтак беларускія рыбаловы штрайкуюць дамагаючыся ўстанаўленьня іхняга дасюлешняга права на лоўлю рыбы.

Чаго канкрэтна дамагаюцца сяляне?

Сяляне выразна заяўляюць — „не аддамо сваіх вазёраў“. Гэты сказ пашырыўся на прасторы дзесяткаў кілямэтраў па берагох Нарача, Мястры і Мядзела.

Сяляне трэбуюць — „аддайце нам нашую рыбу, аддайце нам тую рыбу, якую мелі нашыя дзяды і прадзеды, аддайце нам тую рыбу, якая зьяўляецца нашым штодзеным хлебам, аддайце нам гэты хлеб, каб мы яго маглі лавіць, есьці і прадаваць, а з прадажы плаціць падаткі і жыць“.

Вось галоўны сэнс „бунту“ ціхіх беларускіх сялян-рыбаловаў, гэта галоўныя дамаганьні над Нарачанскіх і Мядзельскіх сялян-рыбаловаў.

п—к.

БЕЛАРУСЫ! Прысылайце ахвяры на фонд беларускай асьветы! — Пашырайце беларускае друкаванае слова. — Навучайце дзяцей чытаць і пісаць пабеларуску!

24036

Aryšty Biełarusaŭ u Łatwii

Hetymi dniami pryjšła ŭ Wilniu sumnaja wiestka, što łatwijskija ŭłady nadowiačy aryštawali mnohich biełaruskich narodna-hramadzkich i kulturnych dziejačoŭ. Pamiž inšymi aryštawany: hram. Kastyluk, Sićko i Płyhaŭka — kiraŭniki biełaruskich škołaŭ u Ryzie, aryštawany tak-ža wučyciel Kudraŭcaŭ, wiedamy dziejač Jezawitaŭ, student Miažecki i studentka Słosman.

Aprača hetaha mnohija biełaruskija wučyciali zwolnieny z pasadaŭ i paddany pad nahlad palicyi.

Treba adznačyć, što abwinieńnie aryštawanych i inšych zapadozranych apiorta nie na faktach, a tolki na biezsensoŭnych zakidach.

Łatwijskija ŭłady zakidajuć aryštawanym biełarusam, što jany byccam chočuć adarwać ad Łatwii častku terytoryi. A na paćwierdžańnie swaich zakidaŭ, byccam paklikajucca na artykuł nadrukawany ŭ „Bieł. Krynicy" Nr. 2 za 1936 h. u jakim apisane prašledawańnie łatyskim nacyjanalizmam biełaruskaha adradženska-wyzwolnaha ruchu ŭ Łatwii.

Sapraŭdy biezsensoŭnaje abwinieńnie biełarusaŭ z boku łatwijskich uładaŭ — kali hetyja wiestki ab abwinieńni praŭdziwyja—a tak-ža biezpadstaŭnaje padpirańnie swajho abwinawačańnia artykułam našaj hazety.

Adnačasna z wyšej padanym, dawiedwajemsia, što łatwijski ŭrad z hetaj nahody zwaročwaŭsia da pradstaŭnictwa polskaha ŭradu i pakazwaŭ na stanowišča arhanizawanych biełarusaŭ pad Polščaj adnosna łatyskaha nacyjanalizmu, jaki hetak mocna prycisnuŭ apošnimi časami biełaruski narodna-adradženski ruch pad Łatwijaj.

Niachaj budzie wiedama łatyskamu ŭradu, što bolš 12 caci miljonny biełaruski narod heta nie etnohrafičnaja masa, jakuju možna pieratwarać na łatyšoŭ, a heta świedamaja swajho „ja" nacyja, jakaja na ŭsialakija pryčynienyja kryŭdy adpawiedna reahuje i budzie reahawać.

Karystajmasia prawam i nie šukajma łaski

U niekatorych słajoch našaha biełaruskaha hramadzianstwa pačynaje ŭkaraniacca zwyčaj šukańnia łaski ŭ čynoŭničym świecie, kab skarystać z prawa. Prykładam — prysłuchoŭwańnie da apinii adzinki z čynoŭničaha świetu ab statutowaj, a hetym samym praŭnaj, dziejnaści lehalna isnujučaj arhanizacyi, i datasoŭwańnie pracy danaj arhanizacyi da pahladaŭ hetaj adzinki z čynoŭničaha świetu. Pry hetym pačynajecca šukańnie pratekcyi, zusim zabywajučysia, što čynawiectwa — heta nie žarało prawa, a tolki wykanalniki zakonu.

Hetkaje źjawišča ŭ wialikaj miery demaralizujučaje dla abiedźwiuch staron — dla našaha hramadzianstwa i dla čynawiectwa. Henaje źjawišča ŭ našym, biełaruskim hramadzianstwie zakaraniaje prakanańnie, što tolki praz łasku čynoŭnika možna niešta asiahnuć. Jano zabiwaje achwotu i wolu da baraćby za swaje zusim zrazumiełyja prawy, a mienš krytyčnych čynoŭnikaŭ prywučaje da fałšywaha pačućcia, što jany sapraŭdy robiać „łasku" wykonywajučy sprawu, jakuju zhodna z zakonam i tak majuć abawiazak wykanać.

Z hetkim źjawiščam treba wiaści rašučuju baraćbu.

Zwaročwajemsia my da ŭłady nia dziela pryjemnaści, a dziela niejkaha abawiazku, jaki wypływaje z patreb hramadzkich, abo z patreby asabistaj, jak hramadzianina. Dziela hetaha my nia prosim u čynoŭnika łaski, a tolki wykanańnia zakonu. My musim damahacca, kab našaja sprawa, z jakoj my zwaročwajemsia, była nam zroblena pawodle abawiazujučych zakonaŭ i bolš ničoha.

Kali my inakš budziem padychodzić da hetaj sprawy, dyk ahułam spynicca ŭsialakaje zmahańnie za swaje prawy i zapanuje stan wyprašywańnia łaski, h. zn. taki stan, u jakim apynulisia niekatoryja z biełarusaŭ, katoryja nazywajuć siabie nawat „patryjarchami" biełaruskaha wyzwalenčaha ruchu.

My nie sumlewajemsia, što ŭ hetkim stanie jany dobra čujucca i što im hetak pastupać wyhadna, ale nia možna dapuścić da taho, kab jany ŭciahnuli ŭ hetki stan šyrejšyja kruhi biełaruskaha hramadzianstwa.

Palitykaj łaski možna asiahnuć tolki prychilnaść adnaho-druhoha čynoŭnika, mahčyma nawat dastać niejkuju maleńkuju kancesiju, abo „padtrymańnie" z konfidencyjanalnych žaroł. Ale nikoli niemahčyma hetakaj palitykaj zabiaśpiečyć na dalejšuju metu mahčymaści ŭsiebakowaha reźwićcia našaha narodu wa ŭsich halinach hramadzkaha žyćcia.

Dyk nia łaski, a wykanańnia zakonu my musim rašuča damahacca.

My nia možam dapuskacca da takoha stanu, kab zakonnyja našyja pačynańni ŭzaležnialisia ad prychilnaści abo niaprychinaści taho ci inšaha čynoŭnika, z katorym wykonwajučy hetuju sprawu možam spatkacca.

Palityka łaski i palityka baraćby za prawa — heta dźwie roznyja rečy.

Palityka łaski zaŭsiody demozalizuje hramadzianstwa, a palityka baraćby za prawa hartuje i ŭzmacniaje hramadzianstwa. Dziela hetaha my praciŭniki palityki łaski i staimo za palityku baraćby.

p.

З беларускага сялянскага жыцьця

(в. Круты-Бераг, Гарадвейскай вол., Нясьвіскага пав.).

Прасьвета. Спачатку польскага панаваньня ў нашым Краю, у нас была прыватная беларуская школа, у якой вучыла пабеларуску вучыцелька, нябожчыцца ўжо, Ганна Малойла. Яна вучыла дзяцей у школе, а з дарослай моладзяй ладзіла беларускія прадстаўленьні. Польскія ўлады былі вучыцельку Ганну арыштаваўшы і пасадзіўшы ў Слонімскі вастрог. Яе хутка з вастрогу выпусьцілі хворую на сухоты і яна скора памёрла. Памяць абвучыцельцы Ганне сьвежая ў нашых людзей і цяпер.

У 1926 годзе вучні Ганны Малойло стойка дамагаліся роднай школы — заахвочвалі старэйшых падаваць дэклярацыі на беларускую школу і кіравалі ў нас гэтай школьнай акцыяй. Дэклярацыі былі паданы. Тады школьны інспэктар паклікаў людзей, што падалі дэклярацыі на беларускую школу, і пачаў угаварываць, каб згадзіліся на ўтраквістычную — польска-беларускую школу. Некаторыя згадзіліся, а некаторыя стаялі цьвёрда за беларускую школу. У выніку не адкрылі ані беларускай, ані утраквістычнай школы — асталася школа польская.

Дарослая моладзь і цяпер ладзіць беларускія прадстаўленьні, пяе беларускія песьні на сцэне і на сваіх таварыскіх зборках. Адным словам, нашая моладзь нацыянальна сьведамая і моцна трымаецца на сваім беларускім становішчы.

Дыплёмацыя польскага вучыцеля. Падрасьлі вучні нашай Ганны Малойло і пачалі брацца за дзела самі. Аднойчы сабраліся, абгаварылі, як пачаць асьветную працу, і пастанавілі зрабіць складку на кніжкі. Сабралі крыху грошай і выпісалі беларускія сцэнічныя творы і беларускі сьпеўнік з нотамі. Прыгатаваліся да прадстаўленьня, навучыліся пяяць і трэба было ўжо толькі паказаць гэта людзям. Але на гэта патрэбны дазвол адміністрацыйнай улады. Пастанавілі запытацца ў польскага вучыцеля, як дастаць дазвол. Вучыцель узяўся дастаць дазвол сам. Паехаў ён у павет і прывёз дазвол, але не на беларускае прадстаўленьне, а на сход моладзі Сход сабраўся і вучыцель пачаў нагаварваць, каб моладзь згадзілася залажыць „Кола млодзежы." Многія згадзіліся. Заснавалася бібліатэка — прыслалі 60 тамоў польскіх кніжак; пачалі ладзіць прадстаўленьні побач з польскімі і беларускія. Вучыцель вучыў пяяць польскія песьні, а моладзь трэбавала, каб вучыў песьні беларускія. Вучыцель узяў беларускія ноты і абяцаў вучыць. Калі ж моладзь дамагалася беларускіх песьняў, вучыцель заявіў, што згубіў ноты.

Недалёка ў Новай-Вёсцы быў гурток Т.Б.Ш. Моладзь пахінулася да сваей арганізацыі і туды хадзіла на прадстаўленьні. Вучыцель за гэта на нашую моладзь абураўся і пробаваў страшыць. Моладзь выступіла з польскага „кола" і аддала вучыцелю арганізацыйныя білеты. Цяпер нашая моладзь робіць беларускую работу, як можа, самастойна і не паддаецца пад кіраўніцтва польскага вучыцеля.

Польскае „кулка рольнічэ" і малачарня. Пасьля заснаваньня „кола млодзежы" пачалі прыяжджаць у нашую вёску інструктары і пачалі нагаварываць, каб залажылі „кулка рольнічэ," а пасьля і малачарню. Сяляне падумалі і некаторыя згадзіліся. Залажылі „кулка рольнічэ" і малачарню. У гэтым „кулку" і да сяньняшняга дня праца не пачалася, калі ня лічыць таго, што сабралі ад некаторых сяброўскія складкі.

Малачарня зусім блага кончылася. Сьпярша пасварыліся, пасьля калаціліся, а цяпер узяліся даносіць адныя на другіх у паліцыю аб усякіх нябыліцах.

Гэтак вось здараецца з арганізацыямі, якія ня ставяцца адразу на адпаведны грунт і засноўваюцца дзеля іншай мэты, а ня дзеля дабра нашага Краю і нашага народу.

Нам трэба закладаць свае беларускія арганізацыі, якія зьвязаны з нашым Краем і з нашым народам.

Комасацыя і мэльёрацыя. Даўно гаварылі нашыя сяляне аб комасацыі: бяднейшыя не хацелі разыходзіцца на хутары, а багацейшыя хацелі хутароў. У 1930 годзе была назначана комасацыйная рада, аў 1931 г. пачалася хутарызацыя і за год кончылася. Некаторыя гаспадары, што дасталі лепшыя хутары, здаволены комасацыяй, а большасьць, што дасталі горшую зямлю, падалі скаргі вышэйшым уладам на кепскую раздзелку зямлі. Пры гэтым пачалася сварка між сялянамі на грунце нездаваленьня з комасацыі. У аднаго селяніна згарэла гумно са збожжам; кажуць людзі, што мусіць нехта падпаліў. Той селянін прадаў свой хутар і ўцёк з вёскі.

Падчас комасацыі прыехаў мэльёратар і пачаў асушаць балота. Сьпярша сяляне капалі вызначаныя равы, а пасьля, калі некаторыя пачалі хітраваць, сяляне збунтаваліся і больш равоў не капалі. Мэльёратар выехаў і больш не паказаўся. Некаторыя кажуць, што мэльёрацыю праводзіць у нас забаранілі ўлады, але ці гэта праўда—ніхто ў нас ня ведае.

Выбары ў сойм і ў самаўрад. У 1922 годзе выбары ў польскі Сойм прайшлі вельмі добра: —хто

Dr. Stanisłaŭ Hrynkiewič

Aświeta 9)

(Ab Narodnym Uniwersytecie i inšych sposabach aświetnaje pracy).

14-15. Muzykalnyja Hurtki, Chory.

Stulna z teatram złučana muzyka, pieśnia, chacia mohuć jany raźwiwacca niezaležna adny ad druhich.

Z pieśniaju spałučana žyćcio narodu, pieśni narodnyja heta byccam skarbnica, dzie schowana toje ŭsieńka, ab čym narod kaliś dumaŭ, čaho chacieŭ, da čaho imknuŭsia. Z pieśni bačym uzdojmy, zaniapady, u pieśniach prajaŭlajecca charaktar hramadzki ludziej. Rola pieśni, kali my nia ŭmiejem acanić, dyk niezaležna ad taho astajecca jejnaja mahutnaść, pad čaram jakoje my zaŭsiody schilajem sercy j hałowy. Pieśnia—supolnaje bahaćcie siabroŭ dadzienaha zhurtawańnia.

Našaju pieśniaju zachopliwajucca narody, nam jaje zajzdrujuć, mała chto moža pachwalicca takoju, jak my. Tolki my samyja nažal nia ŭmiejem acanić usiaho, što majem. Pakidajem swajo pryhožaje, što wyrasła na našych paletkach, što nas trymaje, možna skazać „u žywych," biaremsia za čužuju pieśniu, jana-ž da nas nie prystaje, bo jana nam čužaja, nie adkazwaje patrebam, nie adkazwaje našamu wyabražeńniu ab świecie, ab ludziach, niama tamaka taho žyćcia, z jakoha wyraśli swaje rodnyja melodyi.

U dziejnaści kulturna praświetnaj miesca pieśni wielmi ważnaje — jaje nikoli nia možna abminuć, inakš zmahańnie i ŭsia akcyja našaja pajšła-b nie pa tom šlachu, pa jakim pawinna jści.

Pieśnia, kab spoŭniła swaju zadaču ŭzhadawaŭčuju, treba da jaje padyjści *arhanizowana.* Kab pieśniu my lepš umieli acanić, kab mahli pašyryć kolkaść pieśniaŭ — treba pracy, a pracawać nad pieśniaju možna ŭ *chory.* Ci chor budzie zusim niečym asobnym, ci heta budzie tolki sekcyja pry niejkaj inšaj kulturnaj ustanowie na wioscy.— heta sprawa nie asnaŭnaja. Wiadoma, było-b pažadana, kab heta była adzinka arhanizacyjnaja samastojnaja, a tolki zhurtowanaja ci zsiabrowanaja z druhimi dziela miarkawańniaŭ hrašowych, prestižu, mahčymaści bolš niezaležnaje pracy i h. d.

Pieśniu ŭsie mohuć razumieć, usie mohuć adčuwać, nia ŭsie mohuć adnak piajać. Dyk adnosiny da pieśni buduć *aktyŭnyja* (śpiawak) i *pasyŭnyja* (słuchač). Pasyŭnaści tutaka nia treba razumieć adjemna. Tutaka pasyŭnaść aznačać moža dziejnuju pomač pry pracy nad kulturaju pieśni.

16. Radyjo.

Radyjo siańnia nadta wialiki dziejnik u raspaŭsiudžywańni kultury. Niekalki hadoŭ tamu nazad jašče roskaš, dastupnaja tolki nadta nialikim adzinkam, a siańnia heta źjawišča, biez jakoha niemahčyma sabie ŭjawić narmalnaje žyćcio hramadzianstwaŭ świetu. Radyjo heta krynica praktyčnych wiedamaściaŭ dziela kožnaha i z usich mahčymych halinaŭ. Radyjo ŭ esencyjonalny sposab daje kožnamu jamu patrebnaje, daje mahčymaść šladzić za žyćciom, za padziejami kulturnymi na šyrokim świecie z najbolš hłuchoha kutka wiaskowaha, zahnanaha ad ludziej. Jakaja-ž wializarnaja rola radyja na wioscy, dzie jano moža zastupić knižku, hazetu, lektaraŭ, kali nojdziecca na miescy čaławiek, jaki-b da taho jašče ŭmieŭ naładzić razumnaje karystańnie z aŭdycyjaŭ radyja! Da taho jašče adna starana radyja wielmi ważnaja, heta mianoŭna—što jano nadta tannaje, što jaho možna naładzić amal nia ŭ kožnaha žychara ŭ chacie. Da radyja možna wiarnucca kali tolki zachacieŭšy, jano byccam ždže, kab ułučyć tok i kab paliliś huki z šyrokaha świetu. U radyjo najści možam karysnaje z miłym, tam i muzyka, tam i pieśnia, tam i sprawy haspadarčyja.

Ale! Heta ŭsio wialikija plusy radyja. Maje jano i zahnany, kali majem na ŭwiecie pracu *kulturnuju.* Pieršaja i najważniejšaja zahana, što kab wieści karysnuju pracu, cieraz radyjo, a pracu kažu swaju rodnuju, tuju pracu cieraz jakuju imkniemsia adčynić najchutčej šlach adziny da šyrokaha žyćcia, paswajačyć jaje z tym, što jość najpryhažejšaha, najlepšaha na świecie, dyk dziela hetaha treba mieć swajo radyjo, treba značycca mieć swaje wiaščalnyja stancyi, treba prynamsia mieć upłyŭ na prahramu, na charaktar pracy, jakaja wiadziecca ŭ ich. U našych siańniašnich umowach heta absalutnaja niemahčymaść, heta latucieńnie takoje dalokaje, što moža chutčej tolki pryśnicca. Siańnia my majema radyjo takoje, jakoje razumieje wioska. značycca u mowie polskaj i rasiejskaj, kali sprawa u prahramie ahulnym i možam karystacca prahramami suświetnymi ci prynamsia prahramami macniejšych stancyjaŭ, kali sprawa ab muzycy.

Pamianionaja starana praktyčnaja ŭ radyjo abmiažoŭwaje, zrazumieła, mahčymaści karystańnia z jaho, prynamsia na najbližejšy čas. Daść Boh

як хацеў так і галасаваў. Зусім інакш праводзіліся выбары ў 1928г. У гэтыя выбары ўжо быў падзел у сяле, хто за каго галасуе, а некаторыя выведывалі настрой вяскоўцаў і даносілі за залатоўкі. Словам, пачалася дэмаралізацыя. У 1930 годзе паявіліся ўжо ў нашай вёсцы і Бэ-Бэ—кі, якія нагаварвалі сялян галасаваць не за беларускія сьпіскі, але за польскае Бэ-Бэ. У 1935 г. зусім ня думалі сяляне галасаваць, але іх агітатары пачалі страшыць штрафамі. Некаторыя спужаліся і галасавалі.

Апошнія выбары ў самаўрады прайшлі ў нас так хутка, што сяляне і не агледзіліся, каго яны „выбралі.“ Выбары былі гэткія: — сабралі сялян і заявілі: „выбары ўжо кончаны.“

Арганізацыя. У нас ёсьць „пажарная стража,“ якая заснавана яшчэ ў 1919 годзе. Сьпярша, пакуль самі свае хлопцы гэтай арганізацыяй кіравалі, быў у арганізацыі сулад і яна разьвівалася. Але як стаўся „прэзэсам“ польскі вучыцель, пачаліся ў арганізацыі нелады, пачаліся сваркі.

Агулам кажучы, людзі нашыя цёмныя і дзеля прасьвячэньня іх трэба многа працаваць. Дык працуйма, хто можа і як можа.

Max.

Złučanyja Št. Ameryki prociŭ Japonii

U senacie Zł. Štataŭ Ameryki senatar Pitman — staršynia kamisii zahraničnych spraŭ, — haworačy ab amerykanskaj zahraničnaj palitycy, miž inšym, skazaŭ nastupnaje:

„Japonija choča začynić dźwiery Amerycy ŭ Kitaj, nawat choćby wykanańnie hetaha wymahała-b wajny“.

„Zwaročwaju ŭwahu na japonskuju palityku adnosna Kitaju i wyniki jaje adnosna Zł. Štataŭ Ameryki. Kitaj jašče niezaležnaja dziaržawa, maje mirnyja suadnosiny z usim świetam i choča ŭtrymać najlepšyja handlowyja suadnosiny z nami. Ništo nie pawinna hetym suadnosinam pieraškodzić“.

Aprača hetaha senatar Pitman wystupaŭ prociŭ Japonii za jaje hwałčańnie paktu Lihi Narodaŭ i paktu Kelloga. Pry hetym pramoŭca dama haŭsia bolšaha zbrajeńnia amerykanskaj floty, jakaja budzie zmušana baranić amerykanskija intaresy ŭ Azii ad wyciskańnia ich adtul japoncami.

Słowam, Zł. Štaty Ameryki wyrazna stanowiacca prociŭ Japonii.

Чытайце і пашырайце адзіны беларускі гаспадарскі часапіс „САМАПОМАЧ“! Пробныя нумары высылаюцца бясплатна. Адрас: Red. „Samapomač“, Wilnia — Wilno, Połackaja Nr. 9—4.

Z litoŭskaj presy

Supracoŭnictwa litoŭskaj, biełaruskaj i ukrainskaj akademickaj moładzi

„Chacia z troch tysiač studentaŭ u Wilenskim Uniwersytecie tolki pałowa — dzieci miascowaha nasielnictwa, a ŭsie inšyja prybyli z hłybini Polščy, adnak studenckaja moładź litoŭskaja, biełaruskaja, ukrainskaja, rasiejskaja i žydoŭskaja ŭ Wilenskim Uniwersytecie składaje wialiki pracent. Najbolš jość palakoŭ, tady jduć žydy, rasiejcy, biełarusy i ŭkraincy. Litoŭskich studentaŭ sioleta jość 125 Litoŭcy studenty starajucca z usimi mieć jak najlepšyja adnosiny. Ale, nažal, nie z usimi zrabić im heta ŭdajecca. Z najbolšaj akademickaj hrupaj adnosiny ich nia jość dobryja. Litoŭcy studenty ad hetaj hrupy daznali šmat niapryjemnaści. Litoŭcam henaja hrupa daje zrazumieć, što jany ńie pažadanyja ani ŭ studenckaj samapomačy, ani ŭ inšych polskich studenckich arhanizacyjach.

Susim inakš z studentami inšych narodnaściaŭ. Adnosiny litoŭcaŭ z studentami žydami susim dobryja, z biełarusami i ŭkraincami pryjaznyja, sardečnyja i ŭžo majuć swaju tradycyju. Słaŭnaja minuŭščyna, supolnaje ciapierašniaje hora ŭžo ad samaha pačatku isnawańnia studenckich sajuzaŭ akademickuju moładź hetych narodaŭ mocna miž saboj łučyła. Litoŭskuju, biełaruskuju i ukrainskuju studenckuju moładź łučyła miž saboj tak-ža i ciažkoje ich matarjalnaje pałažeńnie. Pryčynilisia tak-ža niamała da hetaha zbližeńnia adnosiny polskaj akademickaj moładzi.

Haworačy ab supracoŭnictwie litoŭskaj, biełaruskaj i ukrainskaj moładzi, treba padčyrknuć, što jano nie ahraničwajecca tolki da pazyčańnia skryptaŭ i da matarjalnaj pomačy, ale maje i šyrejšy absiah, šyrejšyja mety. Hetych troch nacyjaŭ akademickaja moładź, nakolki pazwalajuć uniwersyteckija i dziaržaŭnyja zakony, supracoŭničaje dziela naležnaha ŭzajemnaha paznańnia. Moładź heta paznajecca ŭzajemna ŭ halinie kulturnych asiahnieńniaŭ i nacyjanalnaj świedamaści. Z hetaj metaj čas ad času adbywajucca supolnyja lekcyi, sabrańni, ekskursii i zabawy. Adnej z takich zabawaŭ jość tradycyjny, ładžany štohod troch sajuzaŭ bal.

Supracoŭnictwa studentaŭ litoŭcaŭ, biełarusaŭ i ukraincaŭ užo dało naležnyja płady. Jano pakazała, što ŭsich ich intaresy iduć u wadnym kirunku. Dziela hetaha starajuccca jany ab jednaść miž saboj nia tolki ŭ unutranym žyćci, ale j u žyćci hramadzkim hetyja try akademickija arhanizacyi zaŭsiody jduć razam. Hetaj akademickaj moładzi troch narodaŭ adziny front pamahaje moładzi baranić u ścienach uniwersytetu swaich prawoŭ, a najbolšuju studenckuju hrupu prakonwaje, što kali adnej z hetych arhanizacyjaŭ budzie zroblena kryŭda, dyk inšyja dźwie pryjduć joj z pomačču“... („Viln. Ryt.“ 4.II.36).

Z nahody 16.II.

„Wiedama nam litoŭcam, što dzień 16 lutaha jość dniom našaha wialikaha narodnaha świata. Heta jość adziny ŭ hodzie dzień, kali na ŭsim świecie, u wa ŭsich dziaržawach, dzie tolki žywuć litoŭcy, łučacca jany ŭ wadnej dumcy i supolna ciešacca słaŭnymi čynami i wialikimi asiahnieńniami swajho narodu. Hetaj dumkaj i supolnaj radaściaj ažyŭleny, litoŭcy na ŭsim świecie starajucca hety dzień prawieści žywiej, uračyściej, biaručy ŭčaście ŭ malitwach, sabrańniach, akademijach, wiečaroch, lekcyjach, pradstaŭleńniach, u muzycy, u pieśniach i h. d... Jość cełу rad dziaržaŭ, jakija i sami prykładajucca da adznačeńnia hetaha litoŭskaha świata, jak napr. sioleta świata Niezaležnaści Litwy budzie adznačana praz dziaržaŭnaje radyjo ŭ: Łatwii, Estonii, Finlandyi, Čechasławacyi, Amerycy...

A jak budzie ŭ našym krai? Ci my, litoŭcy hetaha kraju, astaniomsia? Treba spadziawacca, što ŭ wa ŭsim našym krai, dzie tolki žywie naš narod, dzień 16.II budzie światkawany nia tak, jak zwyčajnaja niadziela, ale tak, jak nadzwyčajnaje hadawoje świata. Jak i ŭ minułyja hady, našy arhanizacyi i ich addzieły ŭ hety dzień buduć mahčy ładzić światkawańnie z lekcyjami, z pawažniejšymi pradstaŭleńniami, pieśniami i inš.

Kali-b hetaha światkawańnia ani dla ohułu, ani nawat dla siabroŭ arhanizacyjaŭ źładzić nia možna było, tady možna budzie jaho adbyć, ładziačy tawaryskija wiečary ci harbatku, dzie pry ahulnym stale taksama možna i pahawaryć i paśpiawać, a ŭ hetym užo nichto nia moh-by pieraškadžać, kali-b hetkija harbatki mieli tolki swojski, siamiejny charaktar“. („Viln' Ryt.“ 11.II.36).

—s—

Prad začaćciem druku hetaha numaru „Bieł. Krynicy“ dawiedalisia my, što polskija administracyjnyja ŭłady zabaranili litoŭcam u Wilni ładzić światkawańnie hadaŭščyny abwieščańnia niezaležnaści Litwy.

P. Ł.

Агульны сход Віленскага Аддзелу Б І.Г.іК.

Гэтым паведамляецца ўсіх сяброў Віленскага Аддзелу Б.І.Г. і К., што дня 26 лютага 1936 г. а г. 7 вечарам адбудзецца агульны гадавы сход Аддзелу.

На парадку дня справаздача з дзейнасьці за мінулы год і выбары новага ўраду.

Усе сябры, ідучы на сход, павінны мець пры сабе сяброўскія білеты.

Урад Віл. Аддз. Б.І.Г.іК.

Нацыянальныя меншасьці і Украінская справа ў Польшчы.

Лявон Васілеўскі — ведамы польскі соцыялістычны дзеяч і б. міністр, —1 г.м-ца прачытаў у Львове рэфэрат на тэму „Нацыянальная справа — актуальная палітычная праблема.“ Прэлегент падаўшы агляд гістарычнай эволюцыі ў Эўропе абгаварыў справу нацыянальных меншасьцяў у Польшчы. Далей прэлегент сказаў наступнае: Польшч мае нацыянальныя меншасьці тэрыторыяльныя і экстэрыторыяльныя. Тэрыторыяльныя меншасьці гэта: Украінцы, Беларусы і Літоўцы, экстэрыторыяльныя: Немцы і Жыды. Жыдоў у Польшчы ёсьць больш трох міліёнаў: яны маюць большыя правы за Беларусаў і Украінцаў. Найважнейшая справа для Польшчы, гэта справа украінская. Украінскую справу прэлегент разглядае па правінцыях: на Палесьсі, Холмшчыне і Падлясі, на Валыні і Галіччыне. Прэлегент цьвердзіць —на Палесьсі насельніцтва гаворыць паукраінску, але яно нацыянальна нясьведамае і ня мае інтэлігенцыі; на Холмшчыне, на Падлясі справа для Украінцаў стаіць блага, бо народная маса ня мае там сваей інтэлігенцыі; на Валыні ўсё этнічнае насельніцтва украінскае, але нацыянальная сьведамасьць там слабая. Цяпер на Валыні Украінцы ня маюць аніводнай украінскай школы. Найбольшая нацыянальная сьведамасьць Украінцаў і найбольшая іхняя палітычная выробленасьць у Галіччыне. Украінцы мелі там прад вайной 3.000 народнык школаў, 12 унівэрсытэцкіх катэдраў у Львове, украінская мова мела роўнапраўнасьць у судох і агулам у грамадзкім жыцьці. Пасьля польска-украінскай вайны Украінцы страцілі чатыры пятых усіх сваіх здабычаў, што мелі пад Аўстрыяй. Школьніцтва амаль усё зутраквізаванае, украінская моладзь напаўняе турмы. Украінская праблема мае міжнароднае значэньне. Польска-украінскую праблему можна разьвязаць ужо цяпер па прыкладу Швайцарыі, або па прыкладу ўзаемнасьці між Швэцыяй і Норвэгіяй. —

З гэтага бачым, што польскія палітыкі шукаюць разьвязкі украінскай справы ў граніцах польскай дзяржавы.

БЕЛАРУСЫ! Падтрымлівайце сваю прэсу. Выпісвайце найстарэйшую беларусую газэту „Беларускую Крыніцу!“

---

pryždžem lepšaje pary, kali ŭmowy ŭ taki ci inšy sposab pieramieniacca i zdabudziem my toje, što patrebnaje kožnamu narodu na šlachu jahonaha razwoju žyćciowaha.

17. Hazety.

Heta adzin z motaraŭ sučasnaha žyćcia, jakim šyroka karystajecca, chto tolki choča mieć adnosiny z masami. Presa heta krynica dabra i krynica adnačasna ŭsiaho błahoha, zaležna ad taho, chto biarecca za henaje mahutnaje aružža. Hetak jano było zaŭsiody i ŭsiudy, što taja samaja pryłada moža być wielmi karysnaju i nadta škodnaju.

Presa heta sposab pracy, biez jakoha niemahčyma abyjścisia ŭ halinie kulturna aświetnaha dziejańnia. Presaju buduć karystacca bibliateki, bibliateki-čytalni, kožny hurtok, kožnaja aświetnaja ŭstanowa. Presa ŭ nas asabliwa ważnaja ŭsiudy, dzie niama mahčymaści inšaje akcyi aświetnaje. Jašče dahetul naš čaławiek nie źniawieryŭsia da drukawanaha słowa, jašče wieryć tamu, što bačyć u druku, jašče maje pašanu da hazety. Na wioscy praktykujecca sposab supolnaha čytańnia hazetaŭ. Treba tolki, kab łučyła hazeta dobraja, kab z jaje była karyść. Karyść hazety nia tolki ŭ palityčnym źmieście, nat naadwarot inšyja storany hazety mobolš ważnyja dziela ŭzhadawańnia adzinki i hramady. Nielha biazumoŭna abminuć pry narysoŭcy prahramy hazety i palityčnaje starany. Čaławieka treba ŭzhadawać usiebakowa. Świadomamu hramadzianinu treba wiedać, što robicca siańnia na świecie, što robicca ŭ dziaržawie, dzie jon žywie, treba wiedać, jak kažuć, na čym čaławiek staić i što ždže jaho zaŭtra.

Presa daŭno ŭžo padzialiła pamiž siabie abawiazki infarmacyjna-uzhadawaŭčyja. Niama taho źjawišča, jakoje nahladałasia kaliś, što adzin orhan moh chapić čytaču, kab zdawolić usie jahonyja patreby i cikawańni. Nat u našym biełaruskim žyćci majem pačatki specyjalizacyi presy. Jość u nas ahulna infarmacyjnyja, palityčna-hramadzkija hazety, jak prykładam wielmi zasłužaja ŭ nacyjanalnaj rabocie „Biełaruskaja Krynica,“ jakaja miž inšym maje wializarnyja zasłuhi i ŭ tym, što šmat zaŭsiody pakidała ŭwahi pytańniam kulturna-aświetnym. Majem my siańnia orhany adumysłowyja dziela moładzi, majem orhany, jakija cikujuć ab sprawach ekanamična haspadarčych. Jość orhany, pryświečanyja pytańniam relihijnym — carkoŭnym i kaścielnym.

Jak užo niekalki razoŭ paŭtaraŭ—mała mieć pryładu, treba da taho jašče ŭmieć jeju karystacca. Mała mieć hazetu, treba jašče ŭmieć jaje čytać. Biazumoŭna, šmat zaležyć ad umiełaści redakcyi, ci zacikawić jana swaich čytačoŭ, ci ŭmiecimie tak napisać ab sprawie, kab wyklikać cikawaść, achwotu da pradumańnia zakranutaha pytańnia. Dziela karyści masawaje ŭ sensie kulturna-aświetnym mała taje raboty, jakuju pakładała redakcyja. Patrebnaje jašče *supracoŭnictwa* čytača. Henaje-ž supracoŭnictwa najlahčej naładzić arhanizowanym sposabam. Treba, kab niekalki ludziej, jakija čytajuć, zaachwocili inšych, kab tyja samyja zachacieli pačytać, treba kab čytajučy wyklikali abmien dumkami, kab kožnaja hazeta była asnowiedździu, dzie krystalizujecca świadomy pahlad na pytańni zakranutyja.

Umiectwa čytać nie takaja prostaja sprawa, jak heta mahło-b prydawacca. Woźmiem dziela prykładu wielmi ważnuju staranu ŭ kožnym orhanie, jaki łučaje na wiosku, a mianoŭna — *karespandecyi*. Wielmi prostyja spaściarohi z žyćcia, abyčajaŭ, niejkija maleńkija mo' na pieršy pahlad sprawy, zakranutyja karespandentam, kali ich naświatlić dobra, kali ŭziać z ich usieńka, što možna, kali zrabić z ich wywady naležnyja, kali datarnawać da kankretnych prablemaŭ, cikawiačych swaju wiosku, dyk robiacca jany nadta i nadta ważnymi mamentami ŭ pašyreńni pahladaŭ u tych, što mieli mahčymaść pračytać niekalki radkoŭ hazety. Sprawa, nad jakoju kožny sam prajšoŭ-by moŭčki, u dyskusyjnym paradku robicca nadta cikawaju. Modnyja da siańnia ŭ Sawietach *naściennyja* hazety, a pieradom *žywyja* hazety pakazywajuć na rol, jakuju mohuć adyhrać drobnyja prablemy, kali jany stajać na asnowie hramadzkaj.

Usiudy, dzie niama nijakaje arhanizacyi, dzie niama ludziej, jakija-b mahli pawiaści kulturnuju pracu, možna čytać hazetu. Sprawa wielmi prostaja — napisać da taje ci inšaje redakcyi, a tych niekalki hrašoŭ supolna zaachwociŭšysia susiedzi ŭmiecimuć znajści. Chaj „hurtok“ čytačoŭ hazety budzie pačatkam šyrejšaje pracy ŭ našaj wioscy, chaj hazeta budzie fundamantam, z jakoha wyraście dalejšy warštat bujniejšaje pracy.

Z čytačoŭ chaj wyrastuć karespandenty. Kali mo' karespandencyi wašyja i nia buduć biezadkładna nadrukowanyja, dyk jany ważnyja dziela redakcyi, jak mataryjał faktyčny dziejnych adnosinaŭ da druku z wašaje starany. Henyja karespandencyi buduć pakazalnikam kantroli čytačoŭ nad redakcyjaju, hetym wy prymusicie trymacca lepšaje formy, hetym wy naładzicie tuju siamju, pradstaŭnikom jakoje budzie drukawany orhan.

Aktyŭnaść zahraničnaj sawieckaj palityki i pahroza japonska-sawieckaj wajny

Apošnimi časami sawieckaja palityka na mižnarodnaj arenie wielmi aktyŭnaja. Nawat majestat śmierci hetaj aktyŭnaści nie paŭstrymaŭ i na pachowinach u Londanie anhielskaha karala Juraha V jana prajaŭlałasia — sawiecki kamisar Litwinaŭ i maršał Tuchačeŭski byli na karaleŭskich pachowinach i adbyli palityčnyja narady z anhielskimi dyplomatami.

Paśla karaleŭskich pachowinaŭ adbylisia narady tak-ža i ŭ Paryžy. Meta hetych naradaŭ — utrymać mir, jakomu pahražajuć imperjalizmy Niamieččyny i Japonii.

Londanskija narady, a paśla i paryskija pierahawory, wyjawili wialikuju adkaznuju rolu Sawietaŭ, jakuju jany hrajuć u mižnarodnaj palitycy. Hetyja narady i pierahawory — pišuć zahraničnyja hazety — zrabili pačatak wialikaha sajuzu dziaržaŭ, jakija trymajucca wersalskaha traktatu i katoryja bajacca Niamieččyny.

Pierahawory sawieckaha pradstaŭnictwa — kamisara Litwinawa i maršała Tuchačeŭskaha — z anhielskimi palitykami ŭ Londanie ŭ Japonii wyklikali pryhnoblenaje ŭraźeńnie. Japonskija wajskowyja kruhi zajaŭlajuć adkryta, što hetkija pierahawory musiać dawieści da sawiecka-japonskaj wajny. Wajna hetaja — zajaŭlajuć henyja japonskija kruhi — musić pačacca, pakul Sawiety jašče nie zapeŭnili sabie poŭnaj pomačy z boku Anhlii, katoraja jaŭna imkniecca da ŭzmacnieńnia Sawietaŭ palityčna i wajskowa. Słowam, japonskija wajennyja kruhi damahajucca nieadkładna wajny z Sawietami.

Koncentracyja wojska na Dalokim Uschodzie.

Aficyjalnaje anhielskaje ahienstwa padaje, što japonskija i mandžurskija addziely wojska mašyrujuć u kirunku hranicy Wonkawaj Manholii. Wonkawaja Manholija i S S.R.R. paśpiešna hatowiacca da wajny ŭdoŭž usiaje mandžurskaje hranicy. Styčki bajawych addziełaŭ paŭtarajucca amal štodzień.

Na japonska-kitajskim froncie piacitysiačnaja wajskowaja hrupa japoncaŭ i mandžuraŭ, pad kamandaj japonskich aficeraŭ, hatowiacca zaniać kitajskuju prawincyju Su-Juan.

Adnym słowam, wajenny pažar na Dalokim Uschodzie japoncy ŭžo raspalajuć.

Prociŭjaponskaja armija ŭ Kitaju

U Kitaju biespraryŭnaja chatniaja wajna. Hetuju niazhodu, jak zaŭsiody, wykarystywaje treciaja starana — Japonija. Ciapier, kali japoncy tam pačali dalej paswojemu zawodzić paradki, kitajcy pačynajuć apamiatywacca i arhanizujuć užo armiju prociŭ japoncaŭ pad uładaj Čang-Kaj-Šeka. Haloŭnuju rolu adyhrywajuć u hetaj prociŭjaponskaj sprawie kitajskija studenty, jakija wyrazna i adkryta wystupili prociŭ japonofilskaj palityki nankinskaha ŭradu. Hetyja kitajskija „paŭstancy" užo zarhanizawali prociŭ Japonii armiju, na čale jakoj staić hienerał Tsian-Huan-Naj

Jak bačym, Kitaj usiož dyki prabudžajecca.

Пісьмы з вёскі

Аб нашай ваколіцы.

Зананова, Вішнеўскай воласьці, Вялейскага пав. Цёмныя і нясьведамыя нашыя вяскоўцы. Жывуць яны на хутарох. Наша ваколіца мае 15 хутароў — палавіна праваслаўных беларусаў, а рэшта польскія асаднікі. Культурнейшага праяву ў жыцьці нашых сялян, як сярод беларусаў, таксама і сярод палякоў-асаднікаў, няма ніякага.

Моладзь нашая крыху нават і дзікаватая—ня ўмее нават з людзьмі абходзіцца: на вясельлях у другіх вёсках б'ецца з суседняй моладзяй, а ў мястэчках б'ецца з кім папала, абы біцца. Здараюцца ў нас і злачынствы. Адзін хлапец за злачынства сядзіць у турме ў Вялейцы. Летась нашых дзікуны на Спаса забілі ў Стахаўцах маладога хлапца; паліцыя арыштавала падазроных і яны ў 3 х яшчэ і цяпер сядзяць у турме да суду. Моладзь—пастушкі на пасьце вучацца, як спрытней можна парнуць чалавека нажом.

Дарагая моладзь, заварочвайся з блуднай дарогі. Выпісывай свае беларускія газэты і кніжкі і чытай іх, каб зусім ня зьдзічэць. І в. К.

Сьпявайма беларускія песьні!

(З Баранавіцкага пав.).

Колькі харастаў і мастацтва ў беларускай народнай песьні — апісаць трудна. Зьмест нашай народнай песьні выказвае гора і радасьці сялянскага жыцьця. Гэты зьмест нашай песьні выяўляе культурны ўзровень беларускага сялянства тае эпохі, з якой паходзіць дадзеная песьня. Пры гэтым зьмест народнай песьні лучыць прошлае з сучасьнасьцяй. А мэлёдыя беларускай народнай песьні — гэта-ж жарало беларускай музыкі. Колькі харастаў і якое мастацтва ў беларускай народнай мэлёдыі, апісаць немагчыма, гэта можна толькі чуць. Нашая народная мэлёдыя, гэта жывы помнік нашай, беларускай мінуўшчыны, гэта помнік беларускай у сівой мінуўшчыне самабытнасьці, гэта помнік беларускай асаблівасьці да няпамятных часоў.

Дык цанем, шануйма і сьпявайма нашую беларускую народную песьню! Вод.

Samahonka.

Alichwiery, Pastaŭskaha paw. Šmat naš narod maje biady, za jakuju sam ni ŭčym nia winawat, ale jość biada, za katoruju winawaty naš narod kruhom. Woźmiem „samahonku". Niaŭžo-ž našyja ludzi nia mohuć abyjścisia biez harełki? Peŭnie ž, mohuć žyć, jaje i nie kaštujučy! Ale nie, pjuć hetuju „haru," za jakuju abo doraha płaciać, abo samy „cisnuć" — honiać samahon. A kali palicyja złowić samahonščyka, tady celymi hadami siadziać za heta ŭ wastrozie.

Braty! stydna i brydka, kab my za harełku dawali achwiary materjalnyja i moralnyja. Kidajma pić manapolku, kidajma hnać i sa- ahonku. P. K.

Biełastok. Biełarusy z hazet mnoha čaho wiedajuć ab Biełastoku. Hety hod byli cikawyja Kalady ŭ Biełastoku. Biełastockija ŭradaŭcy pakazali swoj pratest za abniźku im pensyjaŭ i świata prawieli nadta trezwa. Tolki chadzili jany ŭ teatr i ŭ kiny. Na Nowy Hod u wajawodztwie byŭ bankiet na mety niejkija dabradziejnija. U świata niewialičkija hramadki biezrabotnych u wajawodztwie padchodzili pad wokny z swaimi damahańniami chleba, ale hena ich „paŭstańnie" było wielmi spakojnaje. Dwuch palicyjantaŭ lohka dali im rady. U miastowaj Biełastockaj radzie zajadłaja idzie baraćba žydoŭ z pałakami. Žydy chacieli wyniaści pratest, što ich braty prasledywajucca na polskich uniwersytetach. Pałaki hetaha pratestu nie prapuścili. Z swajho boku pałaki padniali sprawu rytualnaj raźni ŭ žydoŭ bydła. Ale i heta prajšło tak nieraźwiazanym. U Biełastoku žydoŭ kudy bolš, jak chryścijanaŭ. Usie fabryki žydoŭskija, a kramy taksama ŭ ich rukach. Polskija hazety ŭ Biełastoku i to wydajucca žydami. Słowam u Biełastoku ŭsio wiežnieja, dyk žydoŭskaje. Padmiastačkowyja žychary Biełastoku, dyk musić usie biełarusy. Dosyć hlanuć na ich biełaruskija miny i na ich kramy, kab u hetym pierakanacca. Na peryferyjach Biełastoku załožana nadta mnoha polskich światlic, a kožnuju z ich paświačaŭ ksiondz abo pop. Jak ludzi karystajuć z henych polskich świetlic, dyk ja wam, maje wy čytačy, nie skažu hetaha. U prawasłaŭnym žyćci Biełastok ihraje ważnuju rol. Biełastockaje prawasłaŭje ŭ na nowyja darohi ŭstupaje: polskaje prawasłaŭje ŭ nas zawodzicca! Užo my majem specyjalnaha papa na heta. Usio tut robicca, kab na hety pawadok źlawić, jak najbolš, prawasłaŭnych.

Da wialikaha miesta maje pretensyi Biełastok. Heta jon žyćciom swaim pakazwaje. Biełastok lubić teatry i kina. Ukrainski tut teatr cely hod daje pradstaŭleńni i z hetaha niejak prażywaje. Teatr hety abjeźdžaje i bliżejšyja kala Biełastoku miastečki. U biełastockich biełarusaŭ paŭstała dumka zawiazać tut teatr biełaruski. Heta im udałosia-b nepeŭna, ale na heta patrebnyja bajawyja i zwydzierżkaj ludzi. Nie ŭ adnym Biełastoku, ale i šyrej u našym krai biełaruski teatr stwaryŭby nowuju, salidnuju bazu dla biełaruščyny. B.

Roznyja wiestki

Z CARKOŬNAHA PAHOSTU

— Na carkoŭnym pahoście pad Polščaj „тишь да гладь и Божія благодать" — na biełaruskich ziemlach papy — „по старому — по русски" wiaduć biełarusaŭ da Boha; dzie dajecca, dyk i „po polsku już śpiewają", prykładam u Biełastoku. Mitrapalitalnaja hazeta „Слово" užo pierachodzić na ŭtrakwizm — drukujecca i papolsku i parasiejsku. Hladzi Nr. 6 z 1936 h.

— Ukrainski Nawukowy Instytut u Waršawie wydzialiŭ specyjalnuju kamisiju, jakaja pierakładaje prawasłaŭnyja liturhičnyja knihi na ukrainskuju mowu. Hetaja praca adbywajecca pad pratektaratam Mitrapalita Dzianisa.

— U Sawietach maje adbycca sioleta wiasnoj carkoŭny Sabor. Mitrapalit prawasłaŭnaj carkwy ŭ SSRR Piotra Krucicki wiarnuŭsia z ssyłki i ciapier prabywaje ŭ Kałomnie kala Maskwy. Dasiulešni jaho zastupnik mitrapalit Siarhiej pa zahadu ŭłady damahajecca, kab mitrapalit Piotra zroksia z prastołu.

Sabor maje adbycca biez učaścia nižejšaha kleru i biez pradstaŭnictwa miran.

Z POLŠČY

Pesymizm ministra Kwiatkoŭskaha. Padčas naradaŭ sojmawaj budžetnaj kamisii nad budžetam ministerstwa skarbu, pramaŭlaŭ ministr Kwiatkoŭski. Jon zajawiŭ, što sučasnaje haspadarčaje niedamahańnie wyhladaje hetak: wioska pieranasielena i znachodzicca na wielmi roznych stupieniach raźwićcia. Ziemlarobskaja prадukcyja paddajecca ŭzdryhańniam. Druhi ŭdar kryzysu pa šoŭ na świet pracy. Na dapamohu zahranicy ŭ takim raźmiery, kab skora i wyrazna možna było b padniać haspadarčaje raźwićcio Polščy, spadziawacca nia možna.

Padsłuchanaja hutarka ŭ Sojmie. Dwa polskija pasły hawaryli ŭ Sojmie mižsaboju zusim prywatna ab hramadzkich sprawach.

Pas. Kaminski (referent budžetu ministerstwa ziemlarobstwa): „Ja reierawaŭ budžet z poŭnym pierakanańniem, što jon sprawiadliwy".

Pas. Kozicki: „Nie hawary hetaha. Usie dobra znajem, jakija świnstwy i jakija złačziejstwy dziejucca ŭ dziaržaŭnych lasoch".

Pas. Kaminski: „Ja nia wiedaju, a kali wy znajecie štoś kankretnaje, to može-b nam tut raskazali".

Hetuju hutarku padsłuchaŭ čynoŭnik Dyrekcyi Lasoŭ i padeŭ jaje ministru Paniatoŭskamu. Ministr piśmienna źwiarnuŭsia da staršyni budžetnaj kamisii, kab toj wyjaśniŭ hetu sprawu.

Pas. Kozicki wyjaśniŭ, što swajo ćwierdžeńnie apiraje na sprawazdačy Najwyšejšaj Kantrolnaj Pałaty, damahajučsia pry hetym acharony pasłoŭ ad čynoŭnickich podsłuchaŭ.

Uzrost biezrabоćcia. Pawodle padličeńnia Biura Pasrednictwa Pracy, na 1 h. m było ŭ Polščy zarejestrawana 472.526 asob biezrabotnych.

Kara śmierci. Nadowiačy Krakaŭski wajskowy akružny sud zasudziŭ na karu śmierci Ściepana Grendu, jaki niadaŭna zabiŭ inž. Dyljona. Grendu rastralali.

Sialanie jaduć čornuju sol. U Polščy jość swaje kapalni soli, u jakich dabywajecca i dobraja, biełaja, kuchonnaja sol. Sialanie ŭ Polščy sol jaduć čornuju. Heta śćwierdžana ŭ budžetnaj sojmawaj kamisii.

Nowy zakon ab padatku ad niaruchomaści. Dzieła taho, što z hetym padatkam mnoha majuć kłopatu i sialanie, my padajom tut haloŭnyja punkty zakonu ab hetym padatku.

Zakon hety pajawiŭsia 14.I.1936 h. (Dz. Urz. Nr. 3 poz. 14). Na padstawie hetaha zakonu, na siale padlahajuć apadatkawańniu ad niaruchomaści hetkija budynki:

1) tyja budynki, jakija nia majuć suwiazi z ziemlarobskaj haspadarkaj—prykładam: asobnyja damy, jakija addajucca;

2) tyja budynki, jakija pastajanna wydajucca ŭ arendu ŭ całaści abo častkowa na padstawie arendnaha dahaworu, choć by hetkija budynki i byli źwiazanyja z ziemlarobskaj haspadarkaj;

3) usie inšyja budynki, jakija źwiazanyja z ziemlarobskaj haspadarkaj apadatkawańniu nie padlahajuć.

Artykuł 2 hetaha zakonu wyrazna kaža, što wiaskowyja — sialanskija budynki, jakija addajucca ŭ arendu, tolki tady padlahajuć hetamu padatku, kali jany składajucca z bolš, jak 4-och pakojaŭ.

Praktyčna—ŭsie sialanskija chaty, jakija nia majuć bolš jak 4 och pakojaŭ, choć jany i addajucca časami ŭ arendu letnikam, hetamu apadatkawańniu nie padlahajuć.

Z ZAHRANICY

Zakarpackija Ukraincy — ŭ Sibir. Zakarpackim Ukraincam pad uładaj Čechasławaččyny żywiecca apošnim časam tak-ža ciažkawata: niama swaich warštataŭ pracy, niama chleba. Sawiety ŭzdumali hetamu horu pamahčy i zaprapanawali čechasławackamu ŭradu, što mohuć pryniać 50,000 lasnych rabotnikaŭ z Zakarpaćcia i Sławaččyny. Paslali b jany ich u Sibir rubać lasy, abo na ŭschod ad Uralu u saŭchozy.

Rasiejski patryjotyzm u Sawietach. Na zasiadańni CIK-a ŭ Maskwie balšawicki dziejač Łozowskij, u pramowie ab niebiaśpiecy wajny z Japonijaj i Niamieččynaj, dasłoŭna skazaŭ hetak:

„Uzrost rasiejskaha patryjotyzmu jość zakonny i niaminučy, jak adkaz na sajuz Japonii i Niamieččyny".

U hetaj ža sprawie kamunistyčnaja hazeta „Prawda", miž inšym, piša:

„R.S.F.S.R. — najbolšaja z respublik SSRR. Ale nia tolki wielićkaj ruski narod jość pieršym miž roŭnymi.

„Histaryčnej niepraŭdaj. škodnaj hutarkaj jość ćwierdžańnie, što da rewalucyi ruski narod byŭ nacyjaj Obłomowych.

„Ruski rewalucyjny razmach, jak skazaŭ t. Stalin, źjaŭlajecca adnoj z charakternych rysak leninskaha stylu ŭ partyjnaj i dziaržaŭnaj rabocie. Hetyj razmach znachodzić nowy wodhuk u sawieckim žyćci.

„Ruski narod stwaryŭ wialikuju kulturu. I henaja ruskaja kultura adyhrała wializarnuju rolu ŭ raźwićci mnohich narodaŭ SSRR.

„Nienawiść da ruskaha — heta adnačasna nienawiść da ŭsiaho SSRR".

Słowam, rasiejski patryjotyzm abymaje ŭsiu terytoryju SSRR.

Z frontu italijanska abisynskaj wajny. Wajna ŭ Afrycy praciahwajecca i wyhladaje, što nia skora končycca. Biespraryŭnyja adbywajucca bai miž italijanskaj i abisynskaj armijaj. Razmach italijanskaj pieramohi nad abisyncami štoraz spyniajecca. U mnohich wypadkach užo pieramahajuć italijancaŭ abisyncy.

Amerykanskaja pazyčka Abisynii. Amerykanskanskija banki ŭ Čykaho wykazali swaju zhodu dać Abisynii 5 milijonaŭ dalaraŭ pazyčki.

Z KRAJU

Źmiena hranicy Nawahradzkaha paw. Nawahradzkaje wajawodztwa zaprajektawała źmienu hranicy Nawahradzkaha paw. Maje być źlikwidawanyja wołaści: Kušeleŭskaja, Rajčanskaja i Ščorskaja; z Cyrynia maje być pieraniesiena wołaść u Warončy i maje być zasnawana Nawahradzkaja wołaść.

Redaktar Jan Paźniak. Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 2. Wydawiec A. Šutowič